УДК 930:[94:35.07]«1772/1914»(476)

**А. П. Жытко,**
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск;*

**С. А. Талмачова,**
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск,*
*tolmachova.sv@yandex.ru*

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ І КІРАВАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1772–1914 гг.)

*In native and russian historiography the system of bodies of state power and administration in Belarus actively studied. However, most of the research works are based on the resource materials and also on published sources. Currently the common picture of the creation and evolution of local authorities and management in the region do not exist, but only the group thematically, chronologically and methodologically disparate research works. Some subjects of local government is reflected in research works connected with processes of modernization, socio-economic history, politics of autocracy in the region.*

*В современной отечественной и российской историографии активно изучается система органов государственной власти и управления в Беларуси. Однако большинство трудов построено на справочной литературе, а также на опубликованных источниках. В настоящее время обобщающей картины создания и эволюции органов местной власти и управления в крае не создано, а есть только группа тематически, хронологически и методологически разобщенных исследований. Отдельные сюжеты местного государственного управления нашли отражение в исследованиях, посвященных процессам модернизации, социально-экономической истории, политике самодержавия в крае.*

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.) паміж Расіяй, Аўстра-Венгрыяй і Прусіяй з карты Еўропы знікла вялікая дзяржава. Праблема Польшчы на працягу XIX – пачатку XX ст. была краевугольнай у знешнепалітычных стасунках еўрапейскіх краін.

Да Расійскай імперыі была далучана сучасная тэрыторыя Беларусі. Разам з тым праблема новага адміністрацыйна-тэры-

тарыяльнага ўладкавання края і стварэння новых органаў улады і кіравання практычна не з'яўлялася прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. У той жа час літаратура па гісторыі падзелаў Рэчы Паспалітай і іх наступствах даволі багатая. У дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі ў якасці галоўнага канцэптуальнага палажэння выступаў пастулат аб непазбежнасці, заканамернасці і справядлівасці далучэння беларускіх, украінскіх і літоўскіх земляў у склад Расійскай імперыі. У прыватнасці, у сваёй шматтомнай працы «История России с древнейших времен» С. Салаўёў разглядаў падзенне Польшчы з пазіцыі нацыянальна-дзяржаўнага інтарэсу Расіі. Прычыну першага падзелу 1772 г. у сваёй працы «История падення Польшн» ён выводзіў з унутранай шляхецкай анархіі, а далучэнне зямель ВКЛ да Расійскай імперыі лічыў «перамогай верацярпімасці над польскім фанатызмам» [34, с. 582]. У сваю чаргу В. Ключэўскі ў «Курсе русской исторни» сцвярджаў, што прускі кароль прымусіў Расію ўдзельнічаць у гвалтоўным рассячэнні Рэчы Паспалітай замест справядлівага аб'яднання «заходнерускай народнасці» [26, с. 37].

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі праводзіцца думка аб калектыўнай адказнасці манархаў Аўстрыі, Прусіі і Расіі за знішчэнне Рэчы Паспалітай. Гэта пазіцыя абагульнена ў манаграфіі П. Стэгнія «Разделы Польши н диплроматня Екатернны II. 1772, 1793, 1795» [35].

У дарэвалюцыйны перыяд адсутнічалі манаграфічныя даследаванні, прысвечаныя ўтварэнню новых органаў мясцовага дзяржаўнага кіравання на тэрыторыі Беларусі. У пэўнай ступені гэтыя пытанні знайшлі сваё адлюстраванне ў публікацыях О. Эйхельмана [40], І. М. Страхоўскага [36] і інш. Значны інтарэс выклікаюць работы В. А. Еўраінава [11] і В. М. Гесена [4], якія дазваляюць больш поўна разгледзець асобныя аспекты мясцовага дзяржаўнага ўладкавання ў Расійскай імперыі. Далучэнне зямель былога Вялікага Княства Літоўскага і Правабярэжнай Украіны да Расійскай імперыі яны разглядалі як збіранне зямель, якія ўваходзілі ў былую дзяржаву Рурыкавічаў, спадкаемцам якой і лічылася Расія.

Палітыка Кацярыны II і Паўла I у дачыненні да Беларусі, стварэнне тут новых органаў улады разглядаюцца ў шэрагу прац дарэвалюцыйнага даследчыка П. Жуковіча [13–15]. Іх каштоўнасць заключаецца ў значным факталагічным матэрыяле, сабраным аўтарам. П. Жуковіч адзначаў, што Кацярына II не паспела распаўсюдзіць фактычнае ўздзеянне сістэмы абласнога судова-адміністрацыйнага кіравання на землі, далучаныя пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, але яна змагла ўсё ж закласці грунтоўны фундамент для ўвядзення сваёй сістэмы.

У савецкай гістарыяграфіі праблемы дзяржаўнага кіравання і самакіравання амаль да сярэдзіны 1960-х гг. не з'яўляліся прадметам спецыяльнага вывучэння. Панавала меркаванне, што дзяржаўны механізм Расійскай імперыі да пачатку XX ст. з'яўляўся архаічным, не здольным да самаўдасканалення, што і з'явілася адной з прычын краху самадзяржаўя.

Толькі ў 1960 г. і ў 1964 г. прафесарам Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута А. В. Чарновым былі выдадзены матэрыялы даведачнага характару «Государственные учреждения России XVIII в.» [9], дзе прыведзены звесткі аб заканадаўчых актах, апублікаваных у Поўным зводзе законаў Расійскай імперыі, а таксама аб стварэнні новых устаноў, іх структуры, функцыях, пераўтварэннях і ліквідацыі. У 1968 г. пад рэдакцыяй дацэнта гэтага ж інстытута М. П. Ярошкіна быў выдадзены дапаможнік «История государственных учреждений дореволюционной России» [12], дзе прадстаўлены звесткі не толькі аб установах, але і прычынах рэформ дзяржаўнага кіравання ў Расійскай імперыі.

Пытанне аб ўсталяванні расійскай сістэмы кіравання на далучаных тэрыторыях закранал ў сваіх працах беларускія гісторыкі, такія як В. Ю. Ластоўскі [28], У. М. Ігнатоўскі [22; 23], У. І. Пічэта [33]. На працэсе ўсталявання расійскай улады на беларускіх землях пасля падзелаў засяродзіў увагу М. Ільяшэвіч, які коратка разгледзеў асноўныя кірункі царскай палітыкі ў перыяд праўлення Кацярыны II і Паўла I [24].

Усталяванне і эвалюцыя адміністрацыйных органаў улады на далучанай тэрыторыі разглядаліся ў абагульняльных працах беларускіх гісторыкаў: «Гісторыя Беларускай ССР» [6], «Нарысы

гісторыі Беларусі» [30], чацвёрты том шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» [5]. У «Нарысах гісторыі Беларусі» была зроблена спроба па-новаму разгледзець нацыянальную гісторыю нашай краіны. Так, уключэнне беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі ў дадзеным выданні ацэньвалася ў цэлым пазітыўна, паколькі Беларусь апынулася ў складзе цэнтралізаванай, з моцнай вярхоўнай уладай дзяржавы, што прывяло да пэўнай палітычнай стабілізацыі. На думку аўтараў, быў пакладзены канец феадальнай анархіі, аднак царскі ўрад не прызнаваў існавання беларускага этнасу, а этнічныя і моўныя аспекты пры правядзенні тэрытарыяльна-адміністрацыйных межаў не ўлічваліся [30, с. 329].

Неабходна адзначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі праблемы кіравання і самакіравання на тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі выклікаюць павышаны інтарэс сярод айчынный навукоўцаў – як гісторыкаў, так і юрыстаў-прававедаў. У прыватнасці, у працах беларускіх юрыстаў закранаюцца пытанні прававога ўладкавання органаў мясцовага дзяржаўнага апарату [3; 41].

У 1997 г. С. М. Токць абараніў кандыдацкую дысертацыю па праблеме мясцовага дзяржаўнага апарату ў Беларусі ў 30–60-х гг. XIX ст. [39]. У 2007 г. пабачыла свет манаграфія А. А. Кісялёва «Снстема управлення и чиновннчества белорусскнх губернні в конце XVIII – первой половнне XIX в.» [25], у якой аўтар прааналізаваў стварэнне новых органаў улады з часоў імператара Паўла I да сярэдзіны XIX ст., выявіў іх функцыі і склад чыноўнікаў. Пры гэтым А. А. Кісялёў акцэнтаваў увагу на мясцовых органах Міністэрства ўнутраных спраў і суда. Органы гаспадарча-эканамічнага кіравання практычна не з’яўляліся прадметам даследавання. Шэраг аспектаў, прысвечаных дадзенай праблеме, прааналізаваў даследчык Я. К. Анішчанка [1; 2].

Праблема адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання і дзяржаўнага кіравання нацыянальнымі ўскраінамі стала адной з ключавых у расійскай і замежнай гістарыяграфіі ў 1990-х гг. – пачатку XXI ст. Адной з прычын такой з’явы стала тое, што ў гэты час у Расійскай Федэрацыі ўзмацніўся сепаратызм нацыянальных меншасцей, асабліва на Каўказе. З’явіўся шэраг калек-

тыўных і манаграфічных выданняў, у якіх знайшлі адлюстраванне праблемы стварэння і функцыянавання адміністрацыйнага апарату ў Расійскай імперыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі. Да такіх прац адносіцца шасцітомны слоўнік-даведнік «Государственность России...» [8], у якім утрымоўваюцца звесткі аб гісторыі стварэння, структуры, функцыянаванні, штатах, умовах рэфармавання ці ліквідацыі дзяржаўных устаноў усіх узроўняў улады і кіравання да 1917 г. У 2003 г. быў выдадзены даведнік «Губернии Росснйской нмпернн...» [10], у якім змешчаны пералік кіраўнікоў мясцовых адміністрацый і даныя аб адміністрацыйным уладкаванні губерняў. У двухтомнай калектыўнай працы расійскіх аўтараў «Институт генерал-губернаторства н наместннчества в Росснйской империи» даецца прававая характарыстыка інстытута Віленскага генерал-губернатарства да часу яго ліквідацыі ў 1912 г. [21].

Змены ў сістэме кіравання і ва ўзаемаадносінах уладных структур з мясцовым насельніцтвам на тэрыторыі Беларусі аўтары калектыўных выданняў «Западные окранны Росснйской нмпернн» [20] і «Нацнональные окранны Росснйской нмпернн: становленне и развнтне системы управлення» звязваюць з паўстаннямі 1830–1831 і 1863–1864 гг. [31].

Праблемам дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі на беларускіх і літоўскіх землях у XIX ст. прысвечаны шэраг прац сучасных расійскіх гісторыкаў, якія разглядаюць гісторыю Беларусі ў азначаны перыяд з новых метадалагічных пазіцый. Л. Я. Гарызонтаў і А. І. Мілер адзначылі непаслядоўнасць царскай палітыкі і перавагу бюракратычных метадаў у кіраванні на заходніх ускраінах імперыі [7; 29], А. А. Камзолава звярнула ўвагу чытачоў на вялікую ролю інстытута генерал-губернатарства ў кіраванні беларускімі і літоўскімі землямі. На яе думку, шмат што залежала ад індывідуальнага падыходу кожнага генерал-губернатара, які акрэсліваў метады інтэграцыі краю з цэнтрам. Генерал-губернатар, сцвярджае яна, не столькі наглядаў за адміністрацыйным механізмам дзяржаўнай машыны, колькі сам наладжваў і накіроўваў яе ход [27].

У замежнай гістарыяграфіі вялікую ўвагу да праблем гісторыі Беларусі традыцыйна праяўляюць польскія даследчыкі, аднак прадметам іх даследаванняў з'яўляецца палітыка царызму ў сувязі з паўстаннямі 1830–1831 і 1863–1864 гг., а таксама фарміраванне адміністрацыйнага апарату, які праводзіў рэпрэсіўную палітыку ў дачыненні да мясцовага каталіцкага насельніцтва [42; 43]. У сувязі з гэтым высновы польскіх гісторыкаў нярэдка носяць суб'ектыўны характар.

Асобныя пытанні, звязаныя з фарміраваннем і функцыянаваннем мясцовых органаў улады і кіравання, разгледжаны ў шэрагу публікацый А. П. Жытко, С. А. Талмачовай [16–19; 38; 37], А. А. Падарожняй [32]. Дзейнасць дзяржаўных органаў асвятляецца ва ўзаемасувязі з агульнай палітыкай самадзяржаўя на тэрыторыі Беларусі, якая была скіравана на ўніфікацыю кіравання і русіфікацыю насельніцтва края.

Такім чынам, вывучэннем сістэмы органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў Беларусі актыўна займаюцца прадстаўнікі беларускай і расійскай гістарыяграфіі. Аднак большасць прац базуецца на літаратуры даведачнага характару або на апублікаваных крыніцах. На сённяшні дзень абагульняльнай карціны стварэння і эвалюцыі органаў мясцовай улады і кіравання ў краі не створана, ёсць толькі група тэматычна, храналагічна і метадалагічна раз'яднаных даследаванняў. Асобныя сюжэты мясцовага дзяржаўнага кіравання знайшлі месца ў даследаваннях, якія прысвечаны працэсам мадэрнізацыі, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, палітыцы самадзяржаўя ў краі і г. д.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Анішчанка, Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796 гады) / Я. К. Анішчанка; пад рэд. У. А. Сосна. – Мінск: Веды, 1998. – 211 с.

2. *Анищенко, Е. К.* В когтях двуглавого орла: Беларусь во времена Екатерины II (1772–1796 гг.): монография / Е. К. Анищенко. – 2-е изд., доп. – Минск: Изд. В. Хурсик, 2016. – 442 с.

3. *Вішнеўскі, А. Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. для юрыд. і гіст. спецыяльнасцей ВНУ / А. Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Экаперспектыва, 2000. – 313 с.

4. *Гессен, В. М.* Вопросы местного управления / В. М. Гессеи. – СПб.: Юрид. ки. скл. «Право», 1904. – [2], 235, [4] с.

5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Беларусь у складзе Расійскай імперыі (каиец XVIII – пачатак XX ст.) / М. В. Біч, В. В. Яиоўская, С. С. Рудовіч [і інш.]; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва. – Т. 4. – 2005. – 519 с.

6. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Першабытиаабшчынны лад иа тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму / К. І. Шабуия [і інш.]; рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і иш.]. – Мінск: Навука і тэхніка. – Т. 1. – 1972. – 631 с.

7. *Горизонтов, Л. Е.* Парадоксы имперской политики: Поляки в России и русские в Польше / Л. Е. Горизонтов; Рос. акад. иаук, Ин-т славяноведения. – М.: Индрик, 1999. – 270 с.

8. Государственность России: государственные и церковные учреждения, сословиые органы и органы местного самоуправления, едииицы адмииистративио-территориальиого, церковного и ведомствеииого делеиия (конец XV – февраль 1917 г.): словарь-справ.: в 6 кн. / Федер. арх. служба России, ВНИИ документ. и архив. дела; сост. О. Ф. Козлов, В. Ф. Янковская [и др.]. – М.: Наука, 1996–2009.

9. Государствеииые учреждения России в XVIII веке : (Закоиодательиые материалы): справ. пособие / подгот. к печати А. В. Чериов; М-во высш. и сред. спец. образования РСФСР, Моск. гос. ист.-архив. ии-т. – М.: б. и., 1960. – 579 с.

10. Губерини Росснйской империи. История и руководители, 1708–1917. Исторические даниые об образовании губерний, областей, градоначальств и других частей внутрениего управлеиия империей: с указанием высших чинов этого управлеиия в хроиологическом порядке по 1 ноября 1902 г.: книга подг. Деп-том обших дел М-ва виутр. дел в 1902 г. / ред.-сост. Ю. Н. Моруков. – М.: Объед. ред. МВД России, 2003. – 479 с.

11. *Евреинов, В. А.* Граждаиское чинопроизводство в России: Ист. очерк В. А. Евреинова / В. А. Евреииов. – СПб.: тип. А. С. Суворина, 1888. – 116 с.

12. *Ерошкин, Н. П.* История государственных учреждеиий дореволюционной России / Н. П. Ерошкии. – 3-е нзд., перераб. и доп. – М.: Высш. шк., 1983. – 352 с.

13. *Жукович, П.* Россия в царствоваиие императора Павла I / П. Жукович // Журн. М-ва нар. просвешеиия. – 1916. – № 6. – С. 183–226; № 8. – С. 207–263; № 9. – С. 186–275.

14. *Жукович, П.* Сословный состав Западиой России в царствование Екатерины / П. Жукович // Жури. М-ва нар. просвещеиия. – 1915. – № 1. – С. 76–…; № 2 – С. 257–321; № 5. – С. 130–178.

15. *Жукович, П.* Управление и суд в Западиой России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Жури. М-ва нар. просвещения. – 1914. – № 2. – С. 265–…; № 3. – С. 88–120; № 4. – С. 314–355; № 5. – С. 1–43.

16. *Жытко, А. П.* Двараиства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.: манаграфія / А. П. Жытко. – Мінск: Беларус. дзярж. пед. уи-т, 2003. – 233 с.

17. *Жытко, А. П., Талмачова, С. А.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі (канец XVIII – першая палова XIX ст.) / А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Вес. Бел. дзярж. пед. ун-та. – Сер. 2. – 2012. – № 4. – С. 3–7.

18. *Жытко, А., Талмачова, С.* Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства на беларускіх землях (1861–1917 гг.) / А. Жытко, С. Талмачова // Беларус. гістар. часоп. – 2013. – № 4. – С. 4–13.

19. *Жытко, А. П, Талмачова, С. А.* Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да інстытута міравых пасрэднікаў у Беларусі (1861–1904 гг.) / А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. – Сер. гуманіт. навук. – 2013. – № 1. – С. 41–46.

20. Западные окраины Российской империи / под ред. А. Миллера. – М.: Новое литературное обозрение, 2007. – 608 с.

21. Институт генерал-губернаторства и наместничества в Российской империи: в 2 т. / Т. А. Алексеева, В. Г. Афанасьев, В. В. Берсенев [и др.]; под ред. В. В. Черкесова. – СПб.: Юрид. центр Пресс, 2003. – Т. 1. – 2003. – 577 с.; Т. 2. – 2003. – 430 с., [8] л. портр.

22. *Ігнатоўскі, У.* Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця: лекцыі, чыт. студэнтам Бел. дзярж. ун-та / У. Ігнатоўскі. – Мінск: Дзяржвыд. Беларусі, 1926. – 252 с.

23. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. – Мінск: Беларусь, 1991. – 188 с.

24. *Ільяшэвіч, М.* Расійская палітыка на землях былога Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панаваннем Кацярыны II і Паўла I (1772–1801) / М. Ільяшэвіч. – Вільня: [б. в.], 1933. – 24 с.

25. *Киселев, А. А.* Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. / А. А. Киселев. – Минск: Военная академия Республики Беларусь, 2007. – 171 с.

26. *Ключевский, В. О.* Сочинения: в 9 т. / В. О. Ключевский; под ред. В. Л. Янина. – М: Мысль, 1987–1989. – Т. 5: Курс русской истории. – 1989. – 476, [1] с.

27. *Комзолова, А. А.* Политика самодержавия в Северо-Западном крае в эпоху Великих реформ / А. А. Комзолова. – М.: Наука, 2005. – 380 с.

28. *Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 124 с.

29. *Миллер, А. И.* «Украинский вопрос» в политике властей и русском общественном мнении (вторая половина XIX века) / А. И. Миллер. – СПб.: Алетейя, 2000. – 267, [1] с.

30. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / рэдкал.: М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]; Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1994–1995. – Ч. 1. – 1994. – 527 с.

31. Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы управления / отв. ред. С. Г. Агаджанов, В. В. Трепалов. – М.: Славянский диалог, 1998. – 416 с.

32. *Падарожняя, А. А.* Стварэнне органаў кіравання мясцовай земскай гаспадаркай у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях иа падставе «Палажэння» 1903 г. / А. А. Падарожняя // Вес. Бел. дзярж. пед. ун-та. – Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2012. – № 2. – С. 23–27.

33. *Пічэта, У.* Гісторыя Беларусі / У. Пічэта. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2005. – 178 с.

34. *Соловьев, С. М.* История падения Польшн / С. М. Соловьев // Соловьев, С. М. Сочннення: в 18 кн. / [отв. ред. Иванов Н. А.]. – М.: Голос, 1993. – Кн. 14: История Росснн с древнейшнх времен. – 1994. – 638 с.

35. *Стегний, П. В.* Разделы Польшн н днпломатия Екатернны II. 1772, 1793, 1795 / П. В. Стегний. – М.: Междунар. отношеиия, 2002. – 696 с.

36. *Страховский, И. М.* Губернское устройство (Правительственные учреждення). Из Журнала Мнннстерства Юстицин (сент., окт. и ноябр. 1913 г.). / И. М. Страховский. – СПб.: Сенатская тип., 1913. – 168 с.

37. *Талмачова, С. А.* Дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей па адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаванні валасцей (1861–1901 гг.) / С. А. Талмачова // Вес. Бел. дзярж. пед. ун-та. – Сер. 2. – 2015. – № 4. – С. 29–36.

38. *Талмачова, С. А.* Падрыхтоўка да ўвядзення павятовых па сяляискіх справах прысутиасцей на тэрыторыі Беларусі (60–70-я гг. XIX ст.) / С. А. Талмачова // Вес. Бел. дзярж. пед. уи-та. – Сер. 2. – 2015. – № 2. – С. 55–59.

39. *Токць, С. М.* Дзяржаўны апарат царызму ў Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст. (структура, функцыі, чыноўніцкі корпус): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / С. М. Токць; Акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 1997. – 21 с.

40. *Эйхельман, О. О.* Обзор центральиых и местиых учрежденнй управлення в Россин н устава о службе по определенню от правнтельства / проф. О. Эйхельман. – Киев: Тип. Имп. ун-та Св. Владимнра, 1890. – VI, 83 с.

41. *Юхо, І. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / І. А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 269 с.

42. *Fajnhaus, D.* 1863. Litwa i Białorus / D. Fajnhauz. – Warszawa: NERITON; Inst. historii PAN, 1999. – 357 с.

43. Powstanie Styczniowe. 1863–1864. Wrzenie. Boj. Europa. Wizje / pod red. S. Kalembki. – Warszawa: Państwowe Wyd. Naukowe, 1990. – 760 с.